ДА ДНЯ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (ДНЯ РЭСПУБЛІКІ)



# У ІМЯ ПАМЯЦІ І ЛЮБОВІ ДА РАДЗІМЫ

**СМАРГОНЬ. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, краязнаўца Галіна Антонава выступіла перад ваеннаслужачымі на пагранічных заставах «Крыйванцы» і «Каменны Лог».**



Напярэдадні Дня Незалежнасці і Дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў журналістка газеты «Светлы шлях», краязнаўца, публіцыст, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Галіна Антонава сустрэлася з ваеннаслужачымі Смаргонскай пагранічнай групы. Творчыя сустрэчы прайшлі на пагранічных заставах «Крыйванцы» і «Каменны Лог».

Галоўнай тэмай сустрэчы стала прэзентацыя кнігі аўтаркі – «Вайна ў асобах. Непрыдуманыя гісторыі герояў». Выданне ўключае рэальныя ўспаміны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і іх дзяцей, вязняў канлагераў, дзяцей ваеннага ліхалецця, супрацоўнікаў музея і настаўнікаў гісторыі. Кожная гісторыя кранае да глыбіні душы і нагадвае, што за перамогамі і подзвігамі заўсёды стаяць канкрэтныя лёсы.

Акрамя гэтага, Галіна Антонава расказала вайскоўцам пра цікавую гісторыю Смаргоншчыны. Пазнаёміла пагранічнікаў з турыстычнымі брэндамі рэгіёна, знакамітымі землякамі, якія праслаўілі смаргонскі край, а таксама пра мемарыялы, якія захоўваюць памяць пра мінулае.

Сустрэчы прайшлі ў цёплай, душэўнай атмасферы і выклікалі жывую цікавасць сярод пагранічнікаў.

Такія сустрэчы пісьменнікаў з пагранічнікамі носяць пастаянны характар. 15 гадоў таму было падпісана трохбаковае Пагадненне аб творчым супрацоўніцтве Дзяржпагранкамітэта, Саюза пісьменнікаў Беларусі і Рэспубліканскага савета ветэранаў органаў пагранічнай службы.

**Вікторыя Валянцінава**
*Фота* Кацярыны Жалудкевіч










ВАЙНА Ў АСОБАХ
САМАРОДКІ




www.pisateli.by